


НЕ БЫЛО Б ШЧАСЦЯ... 13



ІЗНОЎ ІСТОТНА ПАЦЯПЛЕЕ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

23 ЖНІЎНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 164 (30298)

З першых вуснаў

# «САМАЯ АКТУАЛЬНАЯ ЗАДАЧА — УЗНЯЦЬ ЭКАНАМІЧНАЕ І ІНВЕСТЫЦЫЙНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ДА ЎЗРОЎНЮ ПАЛІТЫЧНАГА»

## Па якіх кірунках варта ўдасканаліць узорнае ўзаемадзеянне Беларусі і Кітая

**Прэм'ер Дзяржаўнага савета Кітайскай Народнай Рэспублікі Лі Цян з афіцыйным візітам наведвае Беларусь. Пачаўся візіт сустрэчай з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, мерапрыемствам хоць і афіцыйным, але па-сяброўску цёплым.**



Фота БелТА.

«Вашаму прыезду мы надаём выключна важнае значэнне. Я думаю, ён можа быць гістарычным», — прывітаў госця Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што апошні раз Лі Цян наведваў нашу краіну амаль 10 гадоў таму, у 2015 годзе, будучы губернатарам. І тады, і сёлета яго візіт праходзіць у знакавы для Беларусі год, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. У 2015-м шырока святкавалі 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Знакавай датай адзначаны і сёлетні, 2024 год. Ён праходзіць пад знакам 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Адметна, што за мір і свабоду на беларускай зямлі ў партызанскіх атрадах, Віцебскім падполлі змагаліся і вашы суайчыннікі-кітайцы. Мы памятаем гэтых герояў. Савецкі Саюз страціў у той вайне 27 мільёнаў чалавек. Кітай у барацьбе з японскімі мілітарыстамі — больш за 35 мільёнаў. Таму Другая сусветная — наш агульны боль. І перамога ў ёй наша агульная, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Нягледзячы на вялікую геаграфічную адлегласць, сёння мы адзіныя не толькі ў ацэнках мінулага, але і ў поглядах на цяперашнюю палітычную сітуацыю, а таксама мы адзіныя ў поглядах на будучыню светаўладкавання».

### «Дзве краіны аказваюць адна адной безумоўную падтрымку»

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што Беларусь і Кітай устанавілі найвышэйшую ў гісторыі ўзровень адносін — усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. «Нас са Старшынёй Сі Цзіньпінам звязвае глыбокае і шчырае сяброўства. Вельмі даўняе сяброўства. Дзве краіны аказваюць адна адной безумоўную падтрымку ў пытаннях, якія закранаюць карэнныя інтарэсы», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка прывёў канкрэтны нядаўні прыклад: у пачатку пандэміі Беларусь першай накіравала ў Кітай самалёт з гуманітарнай дапамогай. Калі ковід дакаціўся да нас, да Беларусі, Пекін аддзячыў у шматразовым памеры, перадаўшы ў Мінск некалькі дзясяткаў тон медыцынскага грузу. «Беларускі народ з разуменнем і вялікай павагай адрэагаваў на вашу дабрыню. Мы ўдзячныя вам за аказанне тэхніка-эканамічнай дапамогі, фактычна бязвыплатнай дапамогі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што нават у складаны перыяд пандэміі ўдалося прадоўжыць узвядзенне падораных нам Кітаем спартыўных аб'ектаў міжнароднага класа — стадыёна і басейна. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, ужо сёння яны становяцца не проста ўпрыгожаннем беларускай сталіцы, а сімваламі дружбы нашых краін.

### Мы разам глядзім у будучыню, а не на бягучыя складанасці

Па выніках мінулага года тавараабарот паміж Беларуссю і Кітаем дасягнуў $8,5 млрд (134,1 працэнта да ўзроўню 2022 года), экспарт тавараў і паслуг — $2,4 млрд (130,6 працэнта).

СТАР. 2

КОРАТКА

- **У Мінску пашпарты гатоўнасці ўжо атрымалі 242 установы агульнай сярэдняй адукацыі.**
- У Беларусі лясгасы нарыхтавалі больш як 1 млн куб. м ветравальна-бураломнай драўніны.
- **У конкурсе «Найлепшы экспарцёр 2023 года» УП «Мінскінтэркапс» перамагло ў намінацыі «Вытворчасць тавараў, прызначаных для лячэння і рэабілітацыі».**
- Каля 15,5 тысячы першакласнікаў сядуць за парты ў новым навучальным годзе ў Гомельскай вобласці. Гатоўнасць устаноў адукацыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна да пачатку навучальнага года абмеркавалі на пасяджэнні аблвыканкама.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Марына ІЛЬІНА, старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама:**

*«Сёлета ў сталічныя гарадскія каледжы на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі мы плануем прыняць 4510 чалавек. На ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 1552. Яшчэ 1427 навучэнцаў прынялі на першы курс каледжы камітэта па ахове здароўя, упраўлення культуры і вучылішча алімпійскага рэзерву галоўнага ўпраўлення спорту і турызму, — расказала Марына Ільіна. — На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі план набору поўнасцю выкананы. Прыём на рабочыя прафесіі ўзроўню прафтэхадукацыі працягваецца. З улікам запатрабаванасці кантрольныя лічбы прыёму павялічаны».*

ISSN 1990 — 763X

Актуальна

# ЭКАЛАГІЧНАЯ І ЭКАНАМІЧНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА

## У чым перавага пелет над іншымі відамі паліва?



**Сярод відаў паліва, якое выкарыстоўваецца ў прыватных дамах, усё большую папулярнасць набіраюць пелеты. Не ўсе домаўладанні могуць быць падключаны да цэнтральнага газазабеспячэння, а ўстаноўка электракатлоў таксама не заўсёды магчымая. Пелеты — добрая сучасная альтэрнатыва, да таго ж экалагічна чыстая і эфектыўная. У чым перавагі выкарыстання пелет? Чым гэта паліва лепшае за традыцыйныя дровы, торфабрыкет і вугаль? Хто і ў якіх аб'ёмах вырабляе пелеты ў Беларусі? Якія прэферэнцыі сёння прапаноўвае дзяржава пры набыцці пелетных катлоў? Чым выгаднае іх выкарыстанне? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты.**

СТАР. 3

Жыццё

# «Вы не экспертызу правялі — вы сэнс жыцця вярнулі»

**Пра дэтэктывы, меладрамы, шчаслівыя знаходкі, учынкі сапраўдных мужчын і іншыя амаль неверагодныя гісторыі са сваёй практыкі расказала карэспандэнту газеты дзяржаўны медыцынскі судовы эксперт.**



Фота дадзена УДКСЭ.

СТАР. 4

# «САМАЯ АКТУАЛЬНАЯ ЗАДАЧА — УЗНЯЦЬ ЭКАНАМІЧНАЕ І ІНВЕСТЫЦЫЙНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ДА ЎЗРОЎНЮ ПАЛІТЫЧНАГА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гандаль паслугамі за гэты ж перыяд склаўся ў аб'ёме больш як $800 млн з ростам больш як на палову да ўзроўню 2022 года.

«Цяпер самая актуальная задача для нас — узняць эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва да ўзроўню палітычнага», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што сёння Кітай — прызнаны лідар у галіне інавацый. Менавіта ў КНР рэалізоўваюцца тэхналагічныя мегапраекты.

«Вы стварылі ўласную сістэму глабальнай навігацыі. Пабудавалі самы вялікі ў свеце тэлескоп. Сканструявалі кітайскую арбітальную станцыю і шырокафюзеляжны самалёт. Кітай лідзіруе ў вытворчасці акумулятараў, сонечных батарэй, высакахуткасных цягнікоў, электрамабіляў, — пералічыў беларускі лідар. — Беларусь з часоў СССР захавала самыя высокія кампетэнцыі ў мікраэлектроніцы, машынабудаванні, касмічнай галіне. У гэтым годзе на міжнародную касмічную станцыю адпраўлены першы беларускі касманаўт. Мы ўваходзім у лік ядзерных дзяржаў і маем вялізныя навукова-тэхнічныя магчымасці, у тым ліку ІТ-сферу. Прапаноўваю вызначыць стрыжнёвай задачай урадаў дзвюх краін на сярэднетэрміновую перспектыву да 2030 года рэалізацыю вялікага прыходу кітайскіх тэхналогій у нашу краіну». Па словах Прэзідэнта, развіццё Беларусі бачыцца ў спалучэнні з канцэпцыяй новых прадукцыйных сіл Кітая на аснове тэхналогій, інавацый і якаснага чалавечага патэнцыялу. Ён перакананы, што разам Беларусь і Кітай здольныя на многае. Знoў канкрэтны прыклад — за 17 гадоў у Беларусі з дапамогай Кітая рэалізавана 27 стратэгічных прамысловых праектаў больш як на 5 млрд долараў.

«Дзякуючы вашай падтрымцы, увасоблена мара нашай краіны — уласны легкавы аўтамабіль «БелДжы», які мы вырабляем на базе «Джылі». За гэта вам асаблівая мая падзяка. Без вас гэтага праекта не было б. Упэўнены, у гэтага праекта ёсць патэнцыял для далейшага развіцця, паглыблення лакалізацыі», — прывёў яшчэ адзін прыклад плённага ўзаемадзеяння беларускі лідар. Цяпер у актыўнай прапрацоўцы з кітайскімі партнёрамі 15 новых інвестпраектаў стратэгічнага ўзроўню на суму звыш 3 млрд долараў. Аляксандр Лукашэнка вылучыў найбольш важныя: трэці этап праекта па глыбокай перапрацоўцы збожжа Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі, будаўніцтва заводаў па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы і ДСП, арганізацыя сучаснага аўтамятызаванага ліцця, вытворчасць рухавікоў, поліпрапілену, карбаміду, хларату натрыю, перакісу вадароду, кальцыніраванай соды. «Мы мяркуем, што прадпрыемствы, якія будуць пабудаваныя ў Беларусі, спатрэбяцца і кітайскай эканоміцы», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ад гэтай сустрэчы даецца старт Году супрацоўніцтва ў галіне навукі, тэхналогій і інавацый (2024—2025 гады). «Перакананы, яго вынікі стануць «дарожнай картай» для нашых урадаў па развіцці супрацоўніцтва ў самых перадавых галінах», — сказаў ён.

Вынікам візіту Лі Цяна стануць падпісаныя дакументы, якія замацоўваюць планы перспектыўнага партнёрства Беларусі і Кітая па ключавых кірунках. «Адзін з іх сапраўды можна назваць гістарычным — гэта Пагадненне аб стварэнні зоны свабоднага гандлю паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый. Беларусь — першая краіна ў ЕАЭС, з якой Кітай заключае такі дагавор. Дзякуючы стварэнню празрыстых і прадказальных правілаў мы чакаем, што ў найбліжэйшыя пяць гадоў экспарт беларускіх паслуг у Кітай вырасце як мінімум на 12—15 працэнтаў, а інвестыцыі ў Беларусь — не менш чым на 30 працэнтаў», — заявіў Прэзідэнт. Ён згадаў словы Старшыні КНР Сі Цзіньпіна аб тым, што мы разам глядзім у будучыню, а не на бягучыя складанасці, што рашэнняў заўсёды больш, чым праблем. «Сустракаючыся ў ліпені ў Астане, мы дамовіліся, што ў час вашага візіту ў Беларусь на ўзроўні ўрадаў зможам абмеркаваць усе канкрэтныя пытанні супрацоўніцтва і знайсці рашэнні. Я вельмі ўдзячны, што і Сі Цзіньпінь, і вы, таварыш Лі Цянь, удзяляеце вельмі шмат часу нашаму супрацоўніцтву. Сведчаннем таму з'яўляецца ваш сённяшні візіт у Беларусь. Мы вам за гэта вельмі ўдзячны. Вы павінны памятаць, што беларусы — увогуле народ вельмі ўдзячны і ніколі ні перад кім не быў у даўгу. За ўсё, што вы зрабілі для Беларусі, мы ўдзячны вам і ў даўгу не застанёмся. Я і нашы міністры настроеныя на працу менавіта ў гэтым духу», — падсумаваў беларускі лідар.

## «Мы павінны шанаваць наша сяброўства, змацаванае крывёй»

Лі Цян прызнаўся, што ён надзвычай рады наведаць Беларусь і сустрэцца з Прэзідэнтам. Ён перадаў Аляксандру Лукашэнку шчырае прывітанне ад Старшыні КНР Сі Цзіньпіна. Па словах Лі Цяна, ён з першых хвілін адчуў гасціннасць беларускага народа. Першым мерапрыемствам у графіку візіту стала ўскладанне кветак да манумента Перамогі ў Мінску. «Гэта нагадвае мне пра тыя часы, калі 80 гадоў таму кітайскі і беларускі народы разам змагаліся ў вайне з фашызмам. Старэйшы сын Маа Цзэдуна — Маа Аньін пераадолеў тысячы кіламетраў і ў якасці інструктара ваяваў у танкавай роце на Першым беларускім фронце. А беларускія салдаты Чырвонай Арміі таксама адправіліся ў Кітай, каб удзельнічаць у барацьбе з захопнікамі. Прыказка сцвярджае: «Сяброўства і братэрства даражэйшыя за ўсякае багацце». Таму я лічу, што мы павінны асабліва шанаваць наша сяброўства, якое змацавана крывёй», — адзначыў Лі Цян.

Прэм'ер Дзяржаўнага савета КНР заўважыў, што за апошнія гады пад кіраўніцтвам Сі Цзіньпіна і Аляксандра Лукашэнкі адносіны Беларусі і Кітая стабільна і ўстойліва развіваюцца. «Мы выйшлі на ўзровень усепагоднага і ўсёбаковага стратэгічнага партнёрства. Нашы адносіны знаходзяцца на беспрэцэдэнтна высокім узроўні. Пастаянна паглыбляецца палітычны ўзаемадавер і паляпшаюцца вынікі дзелавога супрацоўніцтва», — адзначыў ён. Лі Цян нагадаў, што падчас сустрэчы ў Астане ў ліпені гэтага года кіраўнікі дзвюх краін выпрацавалі план далейшага супрацоўніцтва. «У час майго візіту са сваімі беларускімі калегамі я гатовы разам паўнацэнна рэалізаваць дамоўленасці, дасягнутыя на найвышэйшым узроўні, і ў далейшым нарошчваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва на карысць нашых краін і нашых народаў, — запэўніў Прэм'ер Дзяржаўнага савета. — Мы гатовы з беларускім бокам, кіруючыся стратэгіямі, намечанымі двума лідарамі, прыкладаць намаганні, каб дэманстраваць высокі ўзровень адносін ва ўсіх сферах». Па словах Лі Цяна, за 32 гады з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Кітаем і Беларуссю незалежна ад знешняй кан'юнктуры адносіны дзвюх краін заўсёды дэманструюць жыццёвую сілу і энергію. Галоўнай прычынай гэтаму ён назваў высокі давер паміж Кітаем і Беларуссю і кіраўнікамі дзяржаў. «З моманту ўступлення на пасаду Прэзідэнта вы 14 разоў наведвалі Кітай з візітам і задалі стратэгію, новыя арыенціры для ўстойлівага развіцця кітайска-беларускіх адносін. Мы з радасцю адзначаем, што на ўсіх узроўнях, ва ўсіх абласцях падтрымліваем зверку гадзіннікаў і абмен думкамі па пытаннях, якія датычацца інтарэсаў дзвюх краін», — падкрэсліў Лі Цян.

Зверку гадзіннікаў і абмен думкамі Лі Цян правёў і са сваім беларускім калегам, прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам. Вынікам перагавораў стала падпісанне шэрагу міжнародна-прававых дакументаў, якія замацоўваюць планы перспектыўнага партнёрства Беларусі і Кітая па ключавых кірунках супрацоўніцтва.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Заканадаўства

# Змены да лепшага

## У Мінэканомікі расказалі, як новы ўказ будзе спрыяць развіццю рамесніцкай дзейнасці

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 жніўня падпісаў Указ № 328 «Аб ажыццяўленні фізічнымі асобамі рамеснай дзейнасці». У Міністэрстве эканомікі адзначылі, што гэты ўказ паспрыяе развіццю рамесніцтва на аснове нацыянальных традыцый.**

«Дакумент прадугледжвае змяненне падыходаў да ажыццяўлення фізічнымі асобамі рамеснай дзейнасці, накіраванае на аднаўленне гістарычнага сэнсу асаблівага статусу рамесніка як носьбіта ўнікальных навыкаў і ўменняў, традыцыйных для нашай краіны. Прынятыя ўказам нававядзенні будуць садзейнічаць развіццю рамесніцтва на аснове нацыянальных традыцый і перадачы наступным пакаленням», — падкрэслілі ў ведамстве.

Для гэтага ўказ укараняе некалькі ключавых навацый. **Першае.** Ураду дэлегавана права на вызначэнне пераліку відаў рамеснай дзейнасці. Гэта задача павінна быць выканана да 1 верасня 2024 года, а з 1 кастрычніка рэгістрацыя фізічных асоб у якасці рамеснікаў будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з названым пералікам. Акрамя таго, дадатковыя ўнікальныя віды такой дзейнасці на сваёй тэрыторыі могуць вызначаць мясцовыя органы ўлады.

**Другое.** Указам вызначаны катэгорыі грамадзян, за якімі захавана магчымасць выплаты рамеснага збору. Гэта члены Беларускага саюза майстроў, работнікі цэнтраў народнай творчасці, жыхары маланаселеных вёсак (да 50 чалавек), інваліды I або II групы, пенсіянеры. Для атрымання права на выплату збору спатрэбіцца рашэнне мясцовых органаў улады. Астатнія грамадзяне змогуць ажыццяўляць рамесную дзейнасць у адпаведнасці з зацверджаным урадам пералікам, выплачваючы падатак на прафесійны даход.

**Трэцяе.** Указам замацаваны шэраг дзейных сёння прагрэсіўных норм. У мэтах забеспячэння пераемнасці пакаленняў для рамеснікаў захаваны інстытут вучнёўства — права на перадачу сваіх уменняў па дагаворы на бязвыплатнай аснове. Таксама рамеснікам дадзена права рэалізацыі сваіх тавараў: фізічным асобам — на арандаваных плошчах у гандлёвых аб'ектах, гандлёвых цэнтрах, іншых аб'ектах; юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам — па дагаворах куплі-продажу незалежна ад мэты набыцця такімі асобамі тавараў, што рэалізоўваюцца.

**Паводле БелТА.**

Канструктыўны дыялог

# «Мы імкнёмся зрабіць усё, каб моладзь была ўцягнута ў арбіту працэсаў»

## Наталля КАЧАНАВА паўдзельнічала ў заключным пасяджэнні Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе

**Маладыя парламентарыі другога склікання завяршаюць свае паўнамоцтвы. А значыць, час падвесці вынікі вялікай работы, якая ажыццяўлялася на працягу двух гадоў, унесці прапановы па змяненні і дапаўненні ў палажэнне і рэгламент, перафарматаванні рабочых органаў Маладзёжнага савета, каб працаваць яшчэ больш якасна і эфектыўна.**

Маладзёжная палітыка з'яўляецца адным з асноўных кірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі. Асаблівую ўвагу рабоце з моладдзю ўдзяляе спікер. «Час праляятае вельмі хутка, — звярнуўшыся да маладых парламентарыяў з пляцоўкі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, адзначыла Наталля Качанава. — Здаецца, зусім нядаўна мы з вамі сустракаліся, калі вы толькі пачыналі сваю работу, а гэтыя два гады праляцелі імгненна. Мне вельмі хацелася б, каб як мага больш хлопцаў і дзяўчат прайшлі гэтую школу. Гэта ня дрэнна ў такім дастаткова маладым узросце ўбачыць, як працуюць дзяржаўныя органы».

Спікер звярнула ўвагу на тое, што членамі Маладзёжнага савета другога склікання пры Нацыянальным сходзе праведзена сур'ёзная работа, з'явіліся новыя ініцыятывы, праграмы ў сродках масавай інфармацыі, маладыя парламентарыі ўдзельнічаюць у абмеркаванні вельмі важных пытанняў для нашай краіны.

«Маладзёжная палітыка ў нашай сацыяльнай дзяржаўнай палітыцы — адзін з прыярытэтных кірункаў, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Вы ведаеце, як Прэзідэнт адносіцца да работы з моладдзю і заўсёды кажа нам, службовым асобам, што моладзь — будучыня нашай краіны. Таму з ёй трэба працаваць, працаваць на роўных, прыслухоўвацца да яе меркавання, і мы гэта робім. Мы імкнёмся зрабіць усё, каб моладзь была ўцягнута ў арбіту працэсаў, якія адбываюцца, бо вы далей працуеце з моладдзю, якая жыве ў рэгіёнах, у Мінску, даводзячы да іх інфармацыю, якой яны, магчыма, і не валодаюць».

Спікер расказала аб рабоце Савета Рэспублікі на міжнароднай арэне, са зваротамі грамадзян, аб чым маладыя парламентарыі ведаюць не па чутках, бо прысутнічаюць на такіх мерапрыемствах. Асаблівая ўвага падчас сустрэчы была засяроджана на міжнароднай абстаноўцы.

Кажучы аб далейшай рабоце Маладзёжнага савета, Наталля Качанава адзначыла, што напрацоўкі дзеючага склікання будуць працягнуты. «Мы выходзім на такі ўзровень, калі трэба працаваць больш прафесійна», — падкрэсліла яна і ў сувязі з гэтым выступіла з ініцыятывай, каб у перспектыве ў Маладзёжны савет выбіраліся дэпутаты розных узроўняў і члены Савета Рэспублікі — па аналогіі з Расійскай Федэрацыяй.

Спікер падзякавала маладым парламентарыям за зробленае падчас другога склікання. «Той вопыт, які вы назапасілі, упэўнена, спатрэбіцца вам у далейшай рабоце, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Вы — тыя, хто можа прыйсці ў дзяржаўную службу, працаваць у грамадскіх арганізацыях на прафесійнай аснове. Вам трэба рухацца наперад. Трэба смела прасоўваць наперад тыя ідэі і тую работу, якой вы займаліся ў Маладзёжным парламенце. За вамі — будучыня. Вам трэба захаваць нашу краіну».

Напрыканцы сустрэчы, у Зале Перамогі музея, Наталля Качанава ўручыла падзякі шэрагу членаў Маладзёжнага савета другога склікання пры Нацыянальным сходзе.

**Вераніка КАНЮТА.**

*Якія яшчэ пытанні абмяркоўваліся падчас заключнага пасяджэння Маладзёжнага савета другога склікання і на што ў размове з журналістамі звярнула ўвагу спікер, чытайце ў найбліжэйшым выпуску «МС».*

# ЭКАЛАГІЧНАЯ І ЭКАНАМІЧНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА



## ЗАМЕНА ДРОВАМ І ТОРФУ

Што ж уяўляюць сабой пелеты? Гэта тая ж драўніна, але ў больш зручным фармаце — невялікія гранулы з мінімальнай вільготнасцю 10 %, прыдатныя для транспарціроўкі, захоўвання і выкарыстання. Іх вытворчасць даўно наладжана і ў Беларусі, і ў іншых краінах свету.

— Ёсць кацельнае абсталяванне з высокім каэфіцыентам карыснага дзеяння, і працэс спальвання пелет можна цалкам аўтаматызаваць. Ім можна кіраваць праз інтэрнэт і смартфон. Гэта альтэрнатыва цвёрдым відам паліва, такім як дровы, торф, вугаль, але гэта іншы, больш высокі ўзровень эфектыўнасці цеплазабеспячэння, — расказаў **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Віталь КРЭЦКІ.**

Сярод пераваг гэтага паліва — экалагічнасць, нізкая зольнасць, няма неабходнасці нарыхтоўваць як тыя ж дровы, складаваць, пераносіць кожны раз да печы і загружаць. Пелеты загружаюцца прыкладна раз на тыдзень. Да таго ж няма смецця і спецыфічнага паху, як ад торфу.

— Сёння, калі вы хочаце ўстанавіць пелетнае кацельнае абсталяванне, няма неабходнасці рабіць праект, у адрозненне ад такіх патрабаванняў па газазабеспячэнні, дзе робіцца мінімум два праекты: падвод да дому і разводка ўнутры яго. А гэта шэраг узгадненняў, даведак, дазволаў, пры тым што не ў кожным памяшканні можа быць устаноўлены газавы кацёл. Аналагічная сітуацыя і па электрычнасці: патрэбны асобны лічыльнік, лінія, улік, сістэма электразабеспячэння. Трэба атрымаць заключэнні і ўзгадненні, і гэта працэс не хуткі. Пелетны ж кацёл можна набыць і ўстанавіць самастойна, хіба што пусканаладку абсталявання, каб яно працавала правільна, павінна выканаць спецыялізаваная арганізацыя. Арганізаваць цеплазабеспячэнне з дапамогай пелет магчыма за тыдзень: ад пакупкі катла да запуску сістэмы. Газазабеспячэнне ці электразабеспячэнне так хутка арганізаваць немагчыма. Газ як мінімум павінен ісці па вуліцы, а для электрычнага катла энергетыкі павінны вылучыць патрэбную магутнасць, але, на жаль, не ў кожны пункт можна аператыўна працягнуць сеткі, — тлумачыць Віталь Крэцкі.

Паводле яго меркавання, пелетныя катлы нічым не саступаюць тым, што працуюць на прыродным газе. Па зручнасці і эфектыўнасці яны не горшыя, а па эканамічным складніку — нават больш выгадныя.

## ЭКАНАМІЧНЫ АСПЕКТ

Урад гатовы прапанаваць шэраг рашэнняў, каб стымуляваць насельніцтва да выкарыстання пелет.

— Сёння пелеты ўнесены ў пералік як від паліва, на які ўстанаўліваецца фіксаваная цана для насельніцтва — каля 150 рублёў за адну тону для фізічнай асобы. Цана адназначна будзе ніжэйшая, каб затраты чалавека ў ацяпляльны сезон, калі ён адмаўляецца ад дроў, торфу ці вугалю, былі не вышэйшыя за папярэднія ці нават ніжэйшыя. Сёння ліміт або норма водпуску на адну фізічную асобу за ацяпляльны перыяд — дзве тоны пелет, што практычна эквівалентна чатыром кубаметрам дроў або 2,5 тоны вугалю. Пры гэтым вугаль спальваецца ў неэфектыўных катлах — з каэфіцыентам карыснага дзеяння каля 60 %, у пелетных катлоў ён вышэйшы за 90 %. Калі ўзяць усе затраты ў комплексе, то выкарыстанне пелет будзе ў 3-4 разы больш выгаднае, чым іншых відаў паліва, — адзначыў Віталь Крэцкі.

Сёння ўрадам таксама пастаўлена задача па зручнасці забеспячэння пелетамі насельніцтва.

— Усе пытанні дастаўкі дзяржава гатова ўзяць на сябе. Механізм адпрацоўваецца — гэта будзе цэнтралізаваная пастаўка пелет кожнаму грамадзяніну па заяўцы. Па аналогіі з дастаўкай прыроднага газу ў балонах, — патлумачыў Віталь Крэцкі. — Складаванне не спатрэбіцца ўвогуле. Таксама мы прапрацоўваем пытанне аб павелічэнні нормы водпуску, магчыма, гэта будзе чатыры тоны. Пакуль робіцца аналіз, але няма сумненняў, што норма водпуску пелет павялічана. Дзве тоны — гэта было з разліку на дом каля 60 квадратных метраў. Зразумела, што сёння такія дамы ніхто не будуе, трэба весці разлік ад 100 «квадратаў», не менш.

Акрамя таго, з мая бягучага года набыццё айчынных пелетных катлоў увайшло ў спіс народных тавараў, на якія даецца льготны крэдыт «Беларусбанка» пад чатыры працэнты.

— Сёння за кошт гэтага льготнага крэдыту пелетных катлоў купляюць больш, чым электрычных. Работа ў гэтым кірунку намі будзе прадоўжана, — падкрэсліў Віталь Крэцкі.

Дадаткова рыхтуецца рашэнне па субсідзіраванні набыцця пелетных катлоў насельніцтвам.

— Плануецца субсідыя да 40 % ад кошту кацельнага абсталявання, гэта значыць, чалавек, набываючы кацёл разам са спадарожным абсталяваннем, можа заявіцца на субсідыю ад дзяржавы да 40 % ад кошту. Дакумент рыхтуецца па аналогіі з тымі льготамі, якія сёння прапаноўваюцца дзяржавай па электразабеспячэнні. Думаю, што наша прапанова будзе падтрымана, і ў найбліжэйшы час мы ўнясём гэты дакумент на разгляд кіраўніку дзяржавы, — расказаў Віталь Крэцкі.

## КОЛЬКІ ВЫРАБЛЯЕЦЦА Ў КРАІНЕ?

**Начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Андрэй МАЦКЕВІЧ** расказаў, што менавіта Мінлясгас стаяў каля вытокаў пытанняў стымуляцыі выкарыстання пелет насельніцтвам.

— Сістэма Мінлясгаса пайшла па шляху стварэння вытворчасцяў і развіцця магутнасцяў па выпуску гэтага віду паліва. Абумоўлена гэта было ростам так званай зялёнай энергетыкі, асабліва развітой у заходніх краінах, а таксама экспарту ў іншыя краіны — нашы суседзі актыўна яго выкарыстоўвалі, — адзначыў ён. — Сёння мы пачалі актыўна падключаць і наша насельніцтва, і арганізацыі палівазабеспячэння да гэтай работы.

На сёння ў сістэме Мінлясгаса дзейнічае 22 вытворчасці агульнай магутнасцю больш за 350 тысяч тон пелет у год.

— Мы гаворым пра выкарыстанне ў якасці сыравіны для іх вытворчасці і дрывяную драўніну. Калі гаварыць пра адходы дрэваапрацоўкі выключна пад разлік драўнянай сыравіны, то гэта каля 200 тысяч тон, — расказаў спецыяліст. — Для вытворчасці выкарыстоўваем усе адходы дрэваапрацоўкі, атрымліваем бясплатную сыравіну і з нязначнымі затратамі на выхадзе можам прапанаваць насельніцтву невысокую цану.

Папулярнасць пелет як віду паліва ў беларусаў расце.

— Людзі прыходзяць напрамую ў лягасы, якія сёння прызнаны палівазабеспячальнымі арганізацыямі. За гэты год мы рэалізавалі 17 тысяч тон пелет. Лічба не такая высокая, як хацелася б, але разам з тым, калі параўноўваць з усім мінулым годам, то рост па рэалізацыі — практычна ў два разы. Актыўнасць насельніцтва бачым, — падзяліўся Андрэй Мацкевіч. — Калі дом будуецца ў чыстым полі, няма іншых сетак, у перспектыве не прадбачыцца газа- ці электразабеспячэнне, пелеты — добрая альтэрнатыва.

Канцэрн «Беллеспаперапрам» таксама з'яўляецца адным з кансалідаваных вытворцаў гэтага віду прадукцыі.

— Пачынаючы з 2011 года мы арганізавалі такія вытворчасці выключна для забеспячэння комплекснай перапрацоўкі сыравіны, якая выкарыстоўваецца. Адпаведна, гэта давала магчымасць атрымліваць дабаўленую вартасць. Пелеты не мелі пэўнага кола спажыўцоў на ўнутраным рынку і ў большай ступені экспартаваліся ў еўрапейскія краіны. Сёння экспартная накіраванасць у сувязі з санкцыйнымі абмежаваннямі скарацілася, што дазволіла пазнаёміць беларусаў з экалагічным прадуктам. Цяпер папулярызуем гэты від прадукцыі на ўнутраным рынку, — расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення дрэваапрацоўкі канцэрна «Беллеспаперапрам» Віталь КАСТЭНКА.**

Вытворчасць пелет не прадугледжвае выкарыстання ў тэхналогіі якіх-небудзь прысадак або ненатуральных элементаў, што робіць іх на 100 % экалагічна чыстым і бяспечным відам паліва. Мінімальныя адходы, якія ўтвараюцца пры яго выкарыстанні, несупастаўныя з выкарыстаннем дрывяной драўніны.

— Мы са свайго боку выступаем за выкарыстанне гэтага віду цеплазабеспячэння пры ўзвядзенні малапавярховай забудовы, якая вядзецца ў краіне ў даволі прыстойных аб'ёмах. Будзем толькі рады, калі пелеты атрымаюць максімальнае распаўсюджванне, што дазволіць нам забяспечыць загрузку сваіх вытворчых магутнасцяў, — падзяліўся Віталь Кастэнка.

## НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ПРЫВАТНЫХ ДАМОЎ

Усяго ж у краіне 64 прадпрыемствы, якія могуць вырабіць да мільёна тон пелет у год.

— Вядуцца размовы не толькі пра бытавыя катлы і забеспячэнне насельніцтва, але ў першую чаргу пра мадэрнізацыю катлоў на ТЭЦ, якія працуюць на мазуце. Гэтыя прапановы разглядаюцца. Напрыклад, у Расіі ў лютым 2023 года было прынята рашэнне вылучыць 15 мільярдаў расійскіх рублёў на замену мазутных катлоў на пелетныя для падтрымання гэтай галіны. На першы погляд, дорага ў параўнанні з газам, але калі лічыць правільна, то атрымліваецца нават танней, — адзначыў **генеральны дырэктар Рэспубліканскай лесапрамысловай асацыяцыі Валерый АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

Як дадаў Віталь Крэцкі, энергетыкі не адмаўляюцца ад пераводу кацельных камунальнай уласнасці на альтэрнатыўны від паліва. Тры аб'екты разглядаюцца для пераводу на ацяпленне пелетамі.

— Гэта будуць эксперыментальныя аб'екты, у свеце такіх аналагаў няма. На аб'ектах камунальнай уласнасці эфектыўнасць такога спосабу ацяплення пацверджана. Атрымліваецца каласальная эканомія сродкаў у часты вытворчасці таннай цеплавой энергіі. Выдаткі зьмяншаюцца на 40 % за кошт аптымізацыі затрат па заработнай плаце. Адзін чалавек можа абслугоўваць чатыры пелетныя кацельныя, пры тым што на адну дрывяную кацельную патрэбна чатыры аператары. Работа ў энергасістэме вядзецца актыўна, — падкрэсліў Віталь Крэцкі.

## ЯК ПРАЦУЕ ПЕЛЕТНЫ КАЦЁЛ?

Беларускае прадпрыемства «БелКомін», размешчанае ў СЭЗ «Гродна», вырабляе пелетныя катлы і пелетныя гарэлкі. Поўны цыкл вытворчасці адбываецца ў Беларусі, а сэрвісныя філіялы ёсць у кожным рэгіёне краіны. Катлы магутнасцю ад 15 да 1000 кВт выпускаюцца і з ручной загрузкай паліва, і з аўтаматыкай, і без яе.

Такі кацёл камплектуецца пелетным бункерам — ёмістасцю, куды загружаюцца пелеты. З бункера з дапамогай шнэка яны парцыённа падаюцца на гарэлачнае прыстасаванне. Гарэлка мае функцыю аўтараспальвання. Такім чынам, дастаткова націснуць на кнопку раз у сезон, і ацяпленне працуе аўтаматычна.

Акрамя таго, гарэлка аснашчана сістэмай самаачысткі ад рэшткаў паліва. Корпус катла мае эфектыўны цеплаабменнік — каэфіцыент карыснага дзеяння дасягае 94 %, а гэта лічбы газавага катла. Ёсць катлы з аварыйнай камерай загрузкі дроў. Асноўнае паліва — пелеты, але можна прапаліць кацёл дровамі. Кацёл адразу ўкамплектаваны аўтаматыкай. Аўтаматыка надвор'езалежная з датчыкамі вонкавага асяроддзя. Гэта дазваляе падыходзіць да катла раз на тыдзень — для загрузкі бункера. Удзел чалавека ўвогуле мінімальны, патрабуецца толькі загрузіць пелеты і перыядычна ачышчаць кацёл ад попелу.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі назвалі ЗША найбуйнейшай крыніцай ядзернай пагрозы

Міністэрства замежных спраў Кітая назвала ЗША найбуйнейшай у свеце крыніцай ядзернай пагрозы і стратэгічных рызык, паведаміла ТАСС. «Злучаныя Штаты, якія валодаюць самым буйным перадавым ядзерным арсеналам, упарта прытрымліваюцца палітыкі ядзернага стрымлівання, заснаванай на прымяненні ядзернай зброі першымі, працягваючы ўкладваць значныя сродкі ў мадэрнізацыю сваёй ядзернай трыяды і адкрыта адаптуючы стратэгіі ядзернага стрымлівання да іншых краін», — адзначыла на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Маа Нін, каментуючы інфармацыю аб тым, што прэзідэнт ЗША Джо Байдэн ухваліў у сакавіку сакрэтны стратэгічны ядзерны план, у якім упершыню гаворыцца аб стрымліванні Кітая на фоне росту яго ядзерных арсеналаў. Маа Нін таксама заклікала ЗША «добрасумленна паставіцца да сваёй прыярытэтнай адказнасці за ядзернае раззбраенне і прадоўжыць скарачэнне ядзернага арсенала, спыніць пашыраць меры па ядзерным стрымліванні і ядзерныя саюзы, учыняць іншыя дзеянні, якія падрываюць глабальны і рэгіянальны мір і стабільнасць».

### Восем акруг Бангладэш затоплены ў выніку праліўных дажджоў

Тут адзначаецца ўздым узроўню вады ў рэках. Пра гэта паведаміла Dhaka Tribune са спасылкай на Міністэрства па барацьбе са стыхійнымі бедствамі і аказанні надзвычайнай дапамогі краіны. Паводле інфармацыі выдання,



найбольш пацярпела акруга Фені. Адзначаецца, што ўзровень вады ў буйных рэках паўночна-ўсходняга і ўсходняга рэгіёнаў краіны працягвае павышацца, што можа прывесці да далейшага «затаплення нізінных тэрыторый». У пацярпелыя ад паводкі раёны накіраваны вайсковыя і ваенна-марскія сілы краіны. Праводзяцца ратавальныя аперацыі. Таксама здзяйсняецца размеркаванне гуманітарнай дапамогі. На гэты момант па меншай меры 1,6 тысячы чалавек размешчаны ў часовых лагерах.

### У найстарэйшым англійскім тэатры знайшлі «дзверы ў грымёрку Шэкспіра»

У адной з найстарэйшых ратуш Вялікабрытаніі знайшлі арку, якая, магчыма, вяла ў грымёрку Уільяма Шэкспіра, паведаміў Euronews. Цім Фіцхігэм, творчы дырэктар ратушы, сцвярджае, што ў часы драматурга гэтая арка магла весці ў дапаможныя памяшканні, дзе акцёры пераапраналіся і захоўвалі рэквізіт. Мясцовыя гісторыкі сцвярджаюць, што Шэкспір выступаў тут з трупай у 1492 ці 1493 годзе, калі ў Лондане была чума, і артысты вымушаны былі шукаць заробак у іншых гарадах. Летась тут жа знайшлі і сцэну, дзе гэта магло адбывацца: пад пакрыццямі 1950-х гадоў і XVIII стагоддзя выявілі пласт дубовых дошак. Навукоўцы вызначылі, што іх маглі пакласці якраз падчас узвядзення будынка.

# «Вы не экспертызу правялі — вы сэнс жыцця вярнулі»




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Першыя генетычныя экспертызы ў нашай краіне былі праведзены ў 1994 годзе, і вось ужо тры дзесяцігоддзі гэтая навука дапамагае раскрываць крымінальныя справы, а таксама спрыяе звычайным грамадзянам, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, — гаворыць **намеснік начальніка ўпраўлення лабараторных даследаванняў рэчавых доказаў біялагічнага характару ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Брэсцкай вобласці — начальнік аддзела судова-біялагічных і судова-генетычных экспертыз Таццяна КЛІЗА.** — Вельмі важны кірунак нашай работы — экспертыза спрэчнага сваяцтва. За 11 гадоў, з моманту стварэння Камітэта судовых экспертыз, брэсцкія генетыкі правялі 2800 такіх экспертыз. І гэта ўсё рэальнае жыццё, рэальныя людзі, а не выдуманыя гісторыі, вартыя ток-шоу. Гэта слёзы радасці і слёзы расчаравання, гэта шчасце ўз'яднання сем'яў. Мы асабліва радуемся, калі дзеці з дзіцячых дамоў, прытулкаў дзякуючы нашым намаганням ідуць дадому з роднымі бацькамі.

## КАБ ДЗЯРЖАВА ПАВЕРЫЛА Ў МАЦЯРЫНСТВА

Самых розных жыццёвых гісторый у службовым партфелі Таццяны Віктараўны вельмі шмат. Больш за ўсё да экспертаў звяртаюцца мужчыны, каб пацвердзіць альбо выключыць бацькоўства, бо, па зразумелых прычынах, часцей сумняваюцца мужчыны.

Але гэта толькі частка работы генетыкаў — нярэдка даводзіцца даказваць мацярынства. Вось, скажам, жыве сям'я ў абласным цэнтры. Сям'я не бедная, не праблемная, у ёй расце трое дзяцей. Бацька шмат працуе, забяспечвае дабрабыт, маці займаецца выхаваннем і хатняй гаспадаркай. Потым здараецца бяда, галава сям'і трагічна гіне. І жанчына застаецца без сродкаў да існавання. Тут любы скажа, што ёй трэба браць дакументы на дзяцей ды звяртацца ў сацыяльную службу для налічэння дапамогі на дзяцей. А ў гэтым выпадку аказваецца, што дакументаў ніякіх і няма. Роды былі дамашнімі, няма нават даведак з радзільні. Думаеце, фантастыка? Не, рэальны выпадак з практыкі экспертаў. Жанчыне давялося рабіць генетычную экспертызу, даказваць сваё мацярынства, потым выпраўляць дакументы і пісаць заяву на дапамогу. Гэта прыклад для тых, хто па розных прычынах ставіцца да дакументаў з доляй пагарды: маўляў, галоўнае — адносіны, давер, каханне, а паперы — справа другасная. Гэта працуе, калі ўсё добра, а калі нешта пойдзе не так, тады нават маці давядзецца даказваць сваяцтва з уласнымі дзецьмі. Так што лепш усе дакументы заўсёды рабіць своечасова, прынамсі, у нашай дзяржаве. У іншых — іншыя законы, і, бывае, нават пасведчанне аб нараджэнні не доказ, што маці — гэта маці.

Брэсцкія эксперты пацвярджалі мацярынства беларускі, якая выйшла замуж за грамадзяніна Афганістана. У іх нарадзілася двое дзяцей. У нейкі перыяд, калі ў той краіне стала зусім неспакойна, наша суайчынніца вырашыла вярнуцца на радзіму. Калі яна прывезла дзяцей і паспрабавала іх запісаць у школу, садок, узніклі абгрунтаваныя пытанні да яе дакументаў. У адпаведнасці з законамі асобных краін, у пасведчанні аб нараджэнні запісваюць толькі бацьку. А яна, паводле дакументаў, дзецям чужы чалавек. І толькі пасля правядзення экспертызы жанчына змагла атрымаць неабходныя пасведчанні і стаць законнай маці сваім дзецям.


Таццяна КЛІЗА.

## КАЛІ СЫН НАРАДЗІЎСЯ Ў ІНДЫЙСКАЙ ТУРМЕ

Сёння нашы людзі адносна свабодна перамяшчаюцца па свеце. Але гэтае дасягненне цывілізацыі часам абарочваецца зусім нечаканымі праблемамі. Паўсюль свае законы, свае звычаі, традыцыі, і апошняе трэба ўлічваць. Асабліва тым, хто мае непаўналетніх дзяцей. Скажам, адна брастаўчанка вельмі любіла падарожнічаць, а вось законаў прытрымлівацца — не вельмі. І аднойчы трапіла за махлярства ў індыйскую турму аж на 12 гадоў. На момант абвяшчэння прысуду жанчына была цяжарнай, сына нарадзіла ўжо за кратамі. Мясцовае турэмнае кіраўніцтва не абцяжарвала сябе высвятленнем асобы нявольніцы: прозвішча, імя запісалі з яе слоў. А яна вырашыла пажартаваць і назвала прозвішча любімай спявачкі і актрысы Барбары Стрэйзанд. Так і запісалі. Ну і жыла яна там Барбарай, галоўнае, што хлопчык увесь час быў пры ёй. Калі ж прыйшла доўгачаканая воля, суайчынніца адразу паімчала дадому. Найперш у родным горадзе кінулася запісаць сына ў школу. Там, вядома, папрасілі пасведчанне аб нараджэнні. Каб зрабіць яго, звярнулася ў ЗАГС з даведкай, дзе было напісана: «Такога чысла, такога года Барбара Стрэйзанд нарадзіла хлопчыка». Ці трэба казаць пра эмоцыі на твары службовай асобы, якая чытала даведку?

Адным словам, давялося нашай гераіні ісці з сынам у Камітэт судовых экспертыз, праводзіць генетычнае даследаванне, каб атрымаць на рукі доказ, што яна, а не амерыканская актрыса, нарадзіла сына ў індыйскай турме.

## У КАГО ЎДАЛІСЯ ХЛОПЧЫК РЫЖЫ, А ДЗЯЎЧЫНКА БЯЛЯВАЯ?

І калі прыведзеныя вышэй сітуацыі маюць умоўна аб'ектыўны характар, то наступныя, аб якіх гаворка пойдзе ніжэй, выкліканы больш уражаннямі ад ток-шоу ды серыялаў. Людзі нагледзяцца сюжэтаў, як падмянялі дзяцей у радзільных дамах, ды пачынаюць сумнявацца. Жыхары Брэсцкай вобласці, якія пражывалі на момант родаў за мяжой, сталі прыглядацца да сваёй дачкі. Яны абое брунеты з карымі вачыма, а дачушка — блакітнавокая бландзінка. І затачыў чарвяк недаверу, сумневу: а раптам нам дзіця падмянілі. Словам, прыйшлі, правялі экспертызу, упэўніліся, што дачушка — іх крывінка, пайшлі шчаслівыя.

Ім яшчэ сказалі, што гены наогул дзівосна тасуюцца ў прыродзе, іх нашчадак можа ўзяць у спадчыну гены ад папярэдніка з трэцяга, чацвёртага пакаленняў. Так што не варта па колеры валасоў альбо вачэй падазраваць жонку ў нявернасці альбо медыкаў у махлярстве. Памятаеце, як Пушкін жартаваў пра свайго сына: «Чаму гэта наш Сашка рыжы, і ў каго ён такі рыжы?» Значыць, было ў каго. Вось і нашы героі пабеглі дадому гартаць старыя сямейныя альбомы, распытваць бабуль ды цётак пра ўсю радню.

Ды гэта што! Адна 83-гадовая жыхарка райцэнтра сумнявалася больш за 60 гадоў. Менавіта столькі было яе сыну, калі яны прыехалі на экспертызу: нагледзелася бабуля перадач і рашылася. А ўсё таму, што некалі ў раённай радзільні трапіла ў палату з поўнай цёзкай. Прозвішча, імя і нават першая літара імя па бацьку ў маладзіц супадалі. І вось таварышка па палаце прыйшла да яе праз некалькі тыдняў пасля выпіскі ды заявіла, што ім дзяцей пераблыталі, і трэба памяняцца. Яна тады не паслухала, дзіця не аддала, але больш за паўвека ўспаміналa той прыкры выпадак, адзін працэнт верагоднасці ніколі не выкідала са свядомасці. І толькі экспертыза ўсё паставіла на свае месцы, жанчына паехала дадому разам з сынам шчаслівай.

## ПЫТАННІ КРЫВІ

Памятаеце словы аднаго зусім не станоўчага героя «Майстра і Маргарыты»: «Пытанні крыві, каралева, самыя складаныя пытанні ў свеце...» І гэта праўда. Асабліва калі дзеці шукаюць бацькоў. Падобных гісторый у Таццяны Віктараўны колькі хочаш. Ад некаторых проста дрыжыкі бяруць. Ну вось, скажам, адзін мужчына ў маладосці сустракаўся з дзяўчынай, потым іх шляхі разышліся. Ён закахаўся, ажаніўся, нарадзіліся дзеці. І раптам, амаль выпадкова, пачуў, што былая сяброўка памерла, а яе пяцігадовае дзіця аказалася ў дзіцячым доме. Ён пагаварыў з жонкай, падзяліўся меркаваннем, што можа быць бацькам гэтага дзіцяці. І жонка яго падтрымала, сказала, што прыме ў сям'ю дзяўчынку, калі тая акажацца яго дачкой. На экспертызу яны прыйшлі ўсе разам. А малая так хацела знайсці бацьку, што даверліва працягнула ручку да медыка і прамовіла: «Цёця, вазьміце крыві больш, я ж хачу, каб тата знайшоўся». У іх камякі падкаціліся да горла: звычайна ж дзеці баяцца гэтай працэдуры... Тая гісторыя аказалася шчаслівай, дзяўчынку забралі ў сям'ю. А другая, крыху падобная, мела не такі ўдалы фінал. Што тут зробіш — такое жыццё.

## УЧЫНАК, ВАРТЫ САПРАЎДНАГА МУЖЧЫНЫ

Таццяна Кліза гаворыць, што заўсёды суперажывае людзям, якія прыходзяць да іх, бо адважыцца на такую экспертызу не заўсёды бывае проста, нярэдка людзей прыводзяць сямейныя драмы. Яна добра запомніла адну сям'ю, у якой мужчына вельмі любіў сваю дачушку. Гэта было відаць, як той казаў, няўзброеным вокам. Чаму яны вырашылі праверыць бацькоўства, невядома, можа, іншыя сваякі настаялі. Адным словам, ён атрымаў на рукі заключэнне, дзе яго бацькоўства выключалася. Прачытаў, пры гэтым ніводзін мускул на твары не здрыгануўся, потым парваў ліст, кінуў у сметніцу і сказаў жонцы: «Прабач, дарагая, што я сумняваўся, пойдзем дадому». Відавочна, ён даўно зрабіў выбар на карысць сям'і, і гэта быў выбар сапраўднага мужчыны.

Як і ўчынак 18-гадовага хлапчука, якога варта паважліва назваць мужчынам. Навучэнец каледжа сустракаўся з дзяўчынай. А калі яна нарадзіла дзіця, то заявіла, што не гатова быць маці, і пакінула немаўлятка, напісала адмову. Хлопец адразу кінуўся да сваіх бацькоў, расказаў ім, і яны падтрымалі сына, сказалі, што не хочуць, каб іх унучка расла сіратою. На экспертызу ён прыйшоў з бацькамі, органы апекі прывезлі дзіця, а калі яму выдалі заключэнне, ён не мог паверыць: «Выходзіць, я тата!» І адразу ж стаў распытваць, куды яму трэба ісці ў першую чаргу, каб яго дзіця не аддалі ў іншую сям'ю. «Мы былі надзвычай рады, — каментуе эксперт той нядаўні выпадак. — І вельмі ж хочацца, каб у гэтага хлопца ўсё склалася ў жыцці, каб з часам ён стварыў добрую сям'ю і гэтая дзяўчынка вырасла шчаслівай».

## КАЛІ ЁСЦЬ ДЛЯ КАГО ЖЫЦЬ

Таццяна Віктараўна прыводзіла яшчэ шмат розных прыкладаў. Напрыклад, экспертыза дазволіла жанчыне спагнаць аліменты з біялагічнага бацькі дзіцяці, атрымаць дапамогу ў выпадку страты кармільца (экспертыза магчымая і пасмяротна, асабліва калі гаворка ідзе пра маладых мужчын). Бывае, што законны спадчыннік можа атрымаць спадчыну таксама пасля ўстанаўлення бацькоўства. Яшчэ эксперт згадала, якім разгубленым, няўпэўненым прыйшоў да іх бацька пяці дзяцей і якім шчаслівым сыходзіў, бо бацькоўства ўсіх пяцярых пацвердзілі. А другі страціў статус шматдзетнага бацькі непасрэдна ў сценах Камітэта судовых экспертыз, бо з чатырох дзяцей крэўным аказаўся толькі адзін. Гэта жыццё. Без прыкрас, такое, якое ёсць.

Дадатковы зарад энергіі нават для сур'ёзных судовых экспертаў здольная даць гісторыя, падобная на тую, што разгортвалася літаральна ў іх на вачах. У адной жанчыны цяжка захварэў сын. Усе планы і спадзяванні яго, маладога, прыгожага, перакрэсліла анкалагічнае захворванне. Урачы не хавалі ад яе прагнозы. Калі тваё дзіця памірае і ты не можаш нічым дапамагчы, адвечнае ў такіх сітуацыях «за што?», усведамленне бессэнсоўнасці далейшага існавання здольны паставіць на мяжу адчаю і забраць апошнія сілы, так неабходныя для падтрымкі хворага... Але аднойчы ён прызнаўся маці, што некалькі гадоў таму адпачываў на моры, і падазрае, што вынікам той мімалётнай рамантыкі стала дачка. Неяк у сацсетках ён убачыў здымак курортнай знаёмай з дачушкай. Па просьбе маці сын напісаў гэтай жанчыне, яна адказала, пацвердзіла, што нарадзіла дачку ад іх кароткага рамана, але ні на што не прэтэндуе. І ўжо маці ўгаварыла яе прыехаць у Брэст, каб зрабіць экспертызу. А калі ім далі на рукі заключэнне, жанчына свяцілася: «Вы не экспертызу правялі — вы мне сэнс жыцця вярнулі. Цяпер у мяне ёсць унучка, мне ёсць для каго жыць».

Застаецца дадаць, што эксперты-генетыкі цяпер выкарыстоўваюць самае найноўшае абсталяванне. Яны праводзяць і ананімную экспертызу для тых, хто хоча ўпэўніцца ў сваяцкіх сувязях і самастойна прыносіць біялагічны матэрыял. Але юрыдычную сілу для судовых рашэнняў, для выдачы дакументаў мае толькі афіцыйная экспертыза, праведзеная з прысутнасцю суб'ектаў даследавання.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота дадзена УДКСЭ па Брэсцкай вобласці.**

Сядзі і глядзі

# Водгукі Палесся на сацыякультурным

**У нядзелю, 25 жніўня, тэлеканал «Беларусь 3» прапануе для прагляду тэлеверсію гала-канцэрта VIII Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Кліч Палесся».**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Маштабнае свята прымалі 17 жніўня Ляскавічы Петрыкаўскага раёна. Для наведвальнікаў форуму былі падрыхтаваны выступленні аўтэнтычных калектываў, выставы, конкурсы, сустрэчы з пісьменнікамі і шмат іншых актыўнасцяў.

Творчая група сацыякультурнага тэлеканала наведала асноўныя пляцоўкі свята, сустрэлася з гасцямі і выступоўцамі. Падрабязнасці правядзення этнакультурнага фестывалю «Кліч Палесся», а таксама эксклюзіўныя інтэрв'ю з яго арганізатарамі прапануе «Культурны рэпартаж» 25 жніўня ў 16.25.

І ў гэты ж дзень у 16.50 тэлеканал «Беларусь 3» пакажа тэлеверсію гала-канцэрта VIII Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Кліч Палесся».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 205

Наступная задача належыць пінскаму шахматнаму кампазітару Уладзіміру Лебедзеву ***(гл. дыяграму).***



**Белыя:** Kpg5, Фа1, Cb6, пп. a4, a5, c2, c6, e6, f4 (9).

**Чорныя:** Kpd5, пп. d6, e7 (3).

Мат за два хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Вельмі паспяхова выступілі маладыя беларускія шахматысты на чэмпіянатах свету да 20 гадоў па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы. Спаборніцтвы праходзілі ў Ташкенце. За перамогу змагаліся 36 юнакоў і 32 дзяўчыны.

Сярод юнакоў Максім Царук у рапідзе заняў першае месца; на чацвёртым — Арцём Стрыбук, на сёмым — Дзяніс Лазавік. У бліцы залаты медаль заваявалі Д. Лазавік, а М. Царук і А. Стрыбук занялі адпаведна 11-е і 25-е месцы.

«Залаты дубль» — на рахунку мінскай студэнткі Аляксандры Тарасенка. Яна стала чэмпіёнкай у абодвух відах праграмы з аднолькавым вынікам (7,5 бала з 9 магчымых). У рапідзе бронзавы медаль у Варвары Паляковай. Іншыя нашы суайчынніцы зугялі так: 11) Юлія Лявонава; 13) Ксенія Зелянцова; 16) Ксенія Норман; 27) Маргарыта Бендзік. У бліцы вынікі беларусак (апрача чэмпіёнкі) наступныя: 8) К. Зелянцова; 12) К. Норман; 14) М. Бендзік; 16) В. Палякова; 22) Ю. Лявонава.

* * *

На турніры ў сталіцы Шры Ланкі Каломба (157 удзельнікаў) Кірыл Ступак падзяліў 1—5 месцы (па дадатковых паказчыках ён трэці). Міхаіл Нікіценка заняў тут 7-е месца.

У турнірах па бліцы на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 12-е месца з 720. На рахунку Сяргея Жыгалкі 35-е месца з 720, 12-е — з 584, 7-е — з 706 і 34-е — з 543.

* * *

Прапануем некалькі партый з нядаўняга міжнароднага турніру ў Мінску. Пра яго спартыўныя вынікі мы распавядалі ў мінулым выпуску.

Дзмітрый Навіцкі — Аляксандра Тарасенка. 1. d4 Kf6 2. g3 e6 3. Cg2 c5 4. c3 Kc6 5. e4 d5 6. e5 Kd7 7. Ke2 Фb6 8. 0-0 Ce7 9. Kph1 0-0 10. f4 f5 11. c4 cd 12. cd ed 13. C:d5+ Kph8 14. Kd2 Лd8 15. Cg2 Kc5 16. b3 Ce6 17. g4 g6 18. gf gf 19. Kg3 d3 20. Фh5 Лf8 21. Ca3 Фa5 22. C:c5 Ф:c5 23. Kf3 Kd4 24. Лac1 Kc2 25. Ch3 Cf7 26. Ф:f5 Cg6 27. Фg4 Фd5 28. f5 Ke3 29. Фd4 Ф:d4 30. K:d4 d2 31. Лcd1 Cb4 32. a3 Cc3 33. Ke6 K:f1 34. Л:f1 Cf7 35. Ke4 C:e6 36. K:c3 Лac8 37. Kd1 Лc1 38. Kpg1 C:f5 39. e6 Лg8+ 40. Cg2 Ce4, 0:1.

